Б 2/212 Р 1360 ххх Лд № 6.. 1930 г.

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ГОЛАС РАБФАКАЎЦА

Орган колектыву КП(б)Б, ЛКСМБ і прафкому Менскага Рабфаку Б. Дз. У.

№ 6 | Субота 20 сьнежня 1930 г. | № 6

Гос. Публичная Библиотека в Ленинграде с146634

Шчырае прывітаньне выпускнікам—ударнікам дзённага і вячэрняга рабфаку!

Падрыхтоўка кадраў.

Шпаркі рост соцыялістычнага будаўніцтва нашай краіны, значныя дасягненьні ў галіне індустрыялізацыі яе, а таксама ў галіне перабудовы сельскай гаспадаркі ў напрамку арганізацыі дробных індывідуальных гаспадарак ў буйныя калектыўныя гаспадаркі патрабуюць вялікай колькасьці адпаведных пралетарскіх кадраў.

Пытаньне аб пралетарскіх кадрах набывае асабліва вялізарнае значэньне ў сучасны момант, у момант рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты па ўсяму фронту.

У сыстэме падрыхтоўкі соцыялістычных будаўнікоў,—рабфак зьяўляецца першым зьвяном, у мурох якога рабочая, батрацкая і калгасная моладзь рыхтуе з сябе пралетарскіх спэцыялістых узамен спэцыялістых з буржуазнай ідэолёгіяй, якія выяўляюць сябе, як здраднікі інтарэсаў пралетарыяту.

Ужо 8 год Менскі Дзённы Рабфак Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту выпускае з сьценаў Рабфаку самых лепшых, выхаваных у Маркcысцка - Ленінскім напрамку падрыхтаваных тэорэтычна рабочых, батракоў і беднякоў.

Праводзячы ў жыцьцё дырэктывы партыйных органаў, выконваючы задачы, якія стаяць перад намі ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва, ў прыватнасьці, па пытаньні падрыхтоўкі кадраў, дзьве групы апошняга курсу аб'явілі сябе ўдарнымі за скончэньне 4-х гадовага курсу навучаньня рабфаку на працягу 3 з паловай гадоў.

21 сьнежня г/г. у актавай залі БДУ адбудзецца ўрачысты вечар, які будзе прысьвечан выпуску ўдарнікаў рабфакаўцаў, з удзелам рабочых ад усіх прадпрыемстваў г. Менску. У гэты дзень Менскі Дзённы Рабфак выпускае яшчэ 47 таварышоў ударнікаў, і Вячэрны Рабфак выпускае 21 таварыша. Скончыўшыя Рабфакі таварышы папоўняць ВНУ БССР пралетарскімі кадрамі, якія, трэба спадзявацца, і ў далейшым будуць працягваць сваю працу паўдарнаму, як і ў сьценах Рабфаку.

Замест выпушчаных таварышоў, Менскі Дзённы Рабфак набірае 2 групы 1-га курсу агульнага аддзяленьня, у якія будзе прынята 60 асоб, а Менскі Вячэрны Рабфак набірае 5 груп—1 курсу, адну групу 2-га курсу, 1 групу 3 курсу і адну групу 4 курсу. Усяго у Вячэрні Рабфак будзе залічана 320 асоб.

Перад Рабфакам стаіць вялізарнейшая задача ўтварыць падбор студэнтаў з пралетарскага асяродзьдзя, уліць у шэрагі пралетарскага студэнцтва Рабфаку сапраўды рабочую і батрацкую моладзь з бальшым вытворчым і грамадзкім стажам. Але без дапамогі мясцовых партыйных, камсамольскіх, савецкіх і саюзных арганізацый Рабфак з гэтай задачай ня спраыіцца. Неабходна вялікая праца мясцовых арганізацый. На вялікі жаль, практыка мінулых гадоў наказала, што арганізацыі на мясцох ня зусім стала падыходзяць да адбору кандыдатаў на прадмет пасылкі іх на Рабфак. Слаба правсдзіцца мясцовымі арганізацыямі праца ў галіне папулярызацыі прыёму ў Рабфакі сярод пралетарскай моладзі. Колькасьць работніц і батрачак камандыруемых на Рабфакі, недастатковая. Назіраюцца выпадкі, што савецкімі ўстановамі і саюзнымі арганізацыямі завяраюцца анкеты, у якіх ня маецца адказаў на ўсе запытаньні, або адказы не адпавядаюць сапраўнасьці; маюцца выпадкі, калі камандыруюцца т. т. з вельмі малым вытворчым стажам, якія не прайшлі школы грамадзкай працы, а таксама ў паасобных выпадках камандыруюцца насіцелі розных гатункаў антысэмітызму, шовінізму, упадніцкіх і кар'ерыйскіх настрояў.

У выніку такіх адносін мясцовых арганізацый да ўкамплектаваньня Рабфаку, праца прыймовых камісій ускладняецца, а таксама магчымы памылкі камісіі па ўкамплектаваньні. У мэтах лепшага сацыяльнага адбору студэнтаў у Рабфакі неабходна шырока абгаварыць на сходах рабочых, батракоў і калгасьнікаў пастановы партыі аб кадрах і задачах па ўкамплектаваньні навучальных устаноў. Кандыдатуры таварышоў, якія падаюць заявы, неабходна асьвятляць у мясцовым друку (насьценгазэтах, друкаваных шматтыражак), а таксама шырока абгаварыць на сходах рабочых і рабочай моладзі. Дзеля лепшай акадэмічнай падрыхтоўкі рабочай моладзі к прыёму у верасьні м-цы 1931 году патрэбна зараз-жа ўтварыць гурткі, курсы, а таксама арганізаваць індывідуальную дапамогу.

Правільнае ўкамплектаваньне Рабфакаў будзе ў значнай ступені залежыць ад тэй працы, якая будзе разгорнута на мясцох. Часу засталося вельмі мала. Мясцовым арганізацыям неабходна зараз-жа з усёй энэргіяй узяцца да правядзеньне падрыхтоўчай працы ў напрамку практычнага выкананьня дырэктыў партыі па ўкамплектаваньні навучальных устаноў, папулярызацыі прыёму на Рабфак, да выяўленьня больш вытрыманых з больш вытворчым стажам таварышоў з рабочай і батрацкай моладзі. Толькі агульнымі сіламі, толькі агульнай працай усіх арганізацый мы зможам правільна выканаць вялікую задачу падрыхтоўкі кадраў.

Рамановіч.

КАГО ВЫПУСКАЕМ?

9-ты выпуск дзённнага Рабочага Факультэту Б. Дз. У.

Колькі выпускаецца	САЦЫЯЛЬНЫ СТАН				СТАЖ			ПАРТЫЙНАСЬЦЬ			УЗРОСТ			НАЦЫЯНАЛЬН.		
	Рабоч.	с.-г. раб батрак.	Сялян	Служ.	3-5	5-8	8 і выш.	КПБ.	КСМ	б-п.	20-25	25-30	30 і звыш	Белар.	Яўрэяў	Іншых
47	29	9	9	—	9	20	9	38	5	4	21	25	1	20	27	—

Першы выпуск Вячэрняга Рабочага Факультэту Б. Дз. У.

21	16	—	3	2	4	9	7	8	6	7	14	5	2	9	10	2

Чарговаму атраду выпускніноў Менскага Рабфаку, ўноў уліваючамуся ў Вышэйшыя Навучальныя Установы Настрычніінаўскі РІ ІІІ(б)Б шле шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

Бурнае разьвіцьцё соцыялістычнага будаўніцтва, якое знаходзіць сваё выражэньне ў гіганцкай праграме 3-га рашаючага году пяцігодкі, задача выкананьня 5-ці годкі ў чатыры гады, соцыялістычная перабудова сельскае гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва, як клясы на базе суцельнай калектывізацыі і культурная рэвалюцыя праходзяць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і ўзмоцненай падрыхтоўкі да інтэрвенцыі з боку імпэрыялістых, шкодніцтва з боку часткі інтэлегенцыі—ставіць перад намі баявую задачу фарсіраваньне падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў, як аднэй з галоўнейшых задач рэканструкцыйнага пэрыяду.

Правыя элементы, выступаючы супроць лініі партыі ў галіне правядзеньня фарсіраваных тэмпаў рэканструкцыі прамысловасьці і соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, тым самым праводзяць работу супроць лініі партыі ў справе карэннай ломкі і перабудовы працы вышэйшай і сярэдняй школы і ўзмоцненай падрыхтоўкі кадраў.

Актыўная барацьба з правым ухілам, як галоўпай небясьпекай на даным этапе, з „левымі" загібамі, двурушніцтвам і прымірэнцтвам—ёсьць адно з важнейшых мерапрыемстваў па забесьпячэньню правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў партыі па падрыхтоўцы кадраў і выкананьня наступных галоўных задач:

а) Узмацніць Маркcысцка - Ленінскага выхаваньня студэнцтва і падрыхтоўкі актыўных барацьбітоў за генэральную лінію партыі.

б) Далейшага палепшаньня соцыяльнага складу студэнцтва.

в) Падрыхтоўкі спэцыялістых у суадпаведнасьці з запатрабаваньнямі паасобных галін прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і навучальных устаноў

г) Далейшай увязкі тэорэтычнай працы студэнтаў з вытворчым навучаньнем.

д) Правядзеньне ўсёй працы над флагам соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

е) Прыцягненьне пралетарскай грамадзкасьці да будаўніцтва новай школы, на базе шырокага разгортваньня самакрытыкі.

Гэтыя задачы павінны быць вамі праведзены ў жыцьпё ў сьценах Вузаў, куды Вы ўліваецеся новым пралетарскім атрадам.

Шчырае прывітаньне 9 му выпуску дзённага і 1-му выпуску Вячэрняга Рабфаку!

Няхай жыве УсеКП(б)—кіраўнік соцыялістычнага будаўніцтва і яе правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве КП(б)Б!

Кастрычнікаўскі РК КП(б)Б.

Праз Рабфані і Калгасфані ўцягнем новыя тысячы рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў у В. Н. У.

З ПАСТАНОВЫ

Савету Народных Камісараў Б.С.С.Р. пра рэарганізацыі Рабфакаў Б.С.С.Р.

1. Арганізаваць у г. Менску на базе дзённага Рабочага Факультэту Б.Дз.У. тры дзённых Рабфакаў: а) пры Хэміка - Тэхнолёгічным інстытуце, б) пры Будаўнічым Інстытуце і в) пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце, пры чым, студэнты Рабочага факультэту пры Б. Дз. У. павінны разьмяркоўвацца па адпаведных факультэтах Б. Дз. У.

2. На базе Вячэрняга Рабфаку арганізаваць тры вячэрніх Рабфакаў: а) пры Будаўнічым Інстытуце, б) пры Мэдычным Інстытуце і в) пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце.

„Толькі пры далейшай мабілізацыі сіл усёй партыі і рабочае класы вакол задач падрыхтоўкі кадраў з людзей рабочае клясы, толькі пры рашучым зруху ў гэтай галіне можа быць забясьпечана далейшае правядзеньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краіне". (Сталін на XVI зьезьдзе УсеКП(б).

Новы прыём на рабфак павінен быць у цэнтры ўвагі прафарганізацый.

Да 20 сьнежня Рабфак Беларускага зяржаўнага Універсытэту выпускае 68 таварышоў; 68 прадстаўнікоў рабочых і бяднейшага сялянства, узброеныя ведамі за зяроднюю школу, уваходзяць у сьцены Выщэйшых Навучальных Устаноў, каб набыўшы належную адукацыю, кожны ў галіне сваёй выбранай ім спэцыяльнасьці, заняць камандныя вышыні ў будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне.

Зараз-жа пасьля выпуску пачынаецца новы прыём на 1-шы курс; замест выпушчан. з Рабфаку павінны ўвайсьці новыя прадстаўнікі рабочай і калгаснай моладзі. У сувязі з новымі задачамі, якія пастаўлены перад Рабфакам БДУ, арганізацыя новага прыёму, укамплектаваньне яго набывае надзвычайнае значэньне; камандыруючыя арганізацыі, у прыватнасьці прафсаюзы, павінны даць такі склад студэнцтва Рабфаку, які патрэбны ў сучасны момант. Ранішняе адазяленьне Рабфаку БДУ прымацована да Пэдфаку і Пэдінстытутаў. Падрыхтаўка кадраў у галіне культурнага фронту першачарговая задача, якая стаіць перад дзяржавай.

1) Правядзеньне культурнай рэвалюцыі ў горадзе і вёсцы патрабуе шмат новых працаўнікоў, адсутнасьць якіх зьяўляецца тормазам для яе.

2) Культурны фронт у сучасны момант, пачынаючы з ніжэйшых яго ступеняў і да вышэйшых, надзвычайна небасьпечны: рабочая і партыйная праслойка сярод пэдагагаў вельмі малая, камандныя вышыні на навуковым фронце ў большасьці знаходзяцца ў руках астаўшыхся ад дарэвалюцыйных часоў буржуазных сцэцаў, якія ў масе сваёй ідуць у ногу з савецкай уладай і грамадзкасьцю, але ў значнай часцы аказваюцца скрытымі ворагамі яе, аб чым сьведчаць (працэс СВУ, „Прампартыі", прадстаячы працэс беларускіх нацдэмаў). Як жа адносіцца пралетарская моладзь да пытаньня аб паступленьні ў Пэдвузы і Рабфакі, якія да іх падрыхтаўваюць? Трэба адзначыць, што яна недаацэньвае задач, пастаўленых перад пэдагагічнымі вузамі. Моладзь лічыць, што сапраўднае будаўніцтва сацыялізму можа быць толькі ў галінах тэхнічнай і гаспадарчай працы—праца інжэнэра, кіраўніка прадпрыемства, агранома, у рэдкіх выпадках урача—вось дзе належнае месца для рабочай ініцыятывы пралетарскага студэнцтва; што-ж датычыцца пэдагагічнай і навуковай дзейнасьці,—гэта не яго стыхія. Калі мы пабачым, як ішло ўкамплектаваньне ў тэхнічных вышэйшых школ і Пэдвузаў, дык будзе ясна, што сацыяльны склад студэнтаў і партыйная праслойка Пэдвузаў былі найхудшымі ў параўнаньні з іншымі факультэтамі; калі казаць проста—Пэдвузы ў значнай масе запаўняліся тымі, каго па сацыяльнаму адбору не залічалі на іншыя факультэты. Моладзь лічыць, што пэдагагічная і навуковая праца не дае належных умоў, каб разгарнуць свае сілы і выявіць ініцыятыву, што яна наогул для дзеяча-практыка мала цікава. Зараз рабочая кляса у масе сваёй сазнала неабходнасьць падрыхтоўкі пэдагагічных і навуковых кадраў з свайго асяродзьдзя—на зьмену аджываючай буржуазнай навукі ідуць носьбіты яе з асяродку пралетарыяту і бяднейшага сялянства (мы бачым ужо шмат маладых вучоных, прафесароў і асьпірантаў з рабочых). З правядзеньнем культурнай рэвалюцыі у горадзе і вёсцы, сярод калгасьнікаў, з правядзеньнем абавязковага ўсеагульнага навучаньня роля настаўніка, якому даручаецца ня толькі афармленьне дзіцячага інтэлекту, але і ідэёвы яго напрамак, надзвычайна пачэсная і адказная Савецкая ўлада па наказу Леніна імкнецца паставіць настаўніка так высока, як ён не стаіць у буржуазных краінах; і яна дасягне гэтай мэты. Пералом сярод рабочай і партыйнай моладзі адносна поглядаў на Пэдфак вельмі значны, аб чым сьведчаць камсамольскія кампаніі вярбоўкі „тысяч" для запаўненьня пэдагагічных вучэбных устаноў; далей неабходна, каб такія кампанійскія пасылкі ўступілі месца плянаваму, рэгулярнаму камплектаваньню Пэдвузаў і Рабфакаў, падрыхтоўваючых да іх. Камандыруючыя арганізацыі павінны пытаньне падрыхтоўкі новых пэдагагічных і навуковых кадраў паставіць у цэнтры сваёй увагі.

Шкляеў.

ПАРТРАБОТА РАБФАКУ.

У цэнтры ўвагі парткалектыву Рабфаку былі паставлены пытаньні аб выкананьні задач партыі ў галіне падрыхтоўкі, ўзброеных марксыцка - ленінскаи тэорыяй, пралетарскіх спэцыялістых, якія павінны былі стаць на галоўных вучастках фронту сацыялістычнага будаўніцтва. У сувязі з гэтым, партарганізацыя пільна сачыла за тым, каб на Рабфак не пралезьлі сацыяльна-чужыя элементы. Выкрывала апошніх і ставіла пытаньне перад адпаведнымі ворганамі аб пазбаўленьні пралетарскай навучальнай установы ад прымазаўшыхся прадстаўнікоў клясава-варожых нам людзей (Буднік, Апфельбаум, Залескі і інш.). Партарганізацыя ўдзяляла шмат увагі на сувязь студэнтаў Рабфаку з вытворчасьцю, вёскай, Чырвонай Арміяй, шляхам шэфства і садружаства з імі. Парткалектыў мабілізаваў усё студэнцтва Рабфаку на выкананьне ударных задач партыі. Былі арганізаваны суботнікі да дню індустрыялізацыі. Была праведзена вялізарная праца па ўборцы ўраджаю (выезд усяго студэнцтва на 10 дзён у саўгас), пасеўкампаніі і культ-масавая праца на вёсцы. Пад кіраўніцтвам ЦК і Кастрычніцкага РК КПБ, парткалектыву Рабфаку, з ўсёй бальшавіцкай рашучасьцю праводзіў Ленінскую нацпалітыкі партыі, жорстка змагаючыся з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнаи небясьпекай на даным этапе, а таксама з беларускім нац. дэмакратызмам, антысэмітызмам рознымі колярамі шовінізму (яўрэйскі, польскі і інш.). Пертыйная масд была сваечасова мабілізавана на барацьбу з правым ўхілам, як найбольш небясьпечны, левымі заскокамі, якія па сутнасьці зьяўляюцца рэцэдывамі трацкізму і права-левацкім блёкам Сырцова-Ламінадзе за генэральную лінію партыі. Парткалектыў змагаўся з усякімі скрыўленьнямі клясавай лініі партыі па ўсім галінам соц. будаўніцтва. Партыйная маса асудзіла тав. федаровіча, які выступіў у якасьці абаронца кулацкага элемента на сходзе БелАПП'у таксама высказаную ім, у час знаходжаньня ў саўгасе, думку, што трэба рабочым плаціць натурай і аддаваць на часьць, то тады хутчэй пойдзе ўборка. Бюро Парт. калектыву запрапанавала т. Федаровічу напісаць артыкул у друк аб яго адмежаваньні ад вышэйзложанага. Прапанова бюро Федаровічам ня выканана і справа заглохла, ў той час, калі яна мае важнае палітычнае значэньне.

Сваечасова былі асуджаны шкодныя антыпартыйныя думкі студэнта 4-га курсу сябра партыі тав. Шыльдкрота, тым, што вёска ідзе па капіталістычнаму шляху, што сялянскай масе больш зьяўляецца блізкім шлях капіталістычны чым соцыялістычны.

Партдысцыпліна за апошні час у калектыве аслабла. Маюцца выпадкі з боку паасобных сяброў партыі адмаўленьне ад выкананьня партнагрузкі, матывіруючы тым, што трэба працаваць акадэмічна, незьяўленьне асобных партыйцаў на суботнікі і ігнараваньне сходамі, дзякуючы чаму, шэраг сходаў былі саваны.

Нягледзячы на наяўнасьць хістаньня і скрыўленьня клясавай лініі паасобнымі сябрамі партыі. Парткалектыу у асноўным зьяўляецца здаровым і ідэолёгічна вытрыманым.

Крытыка і самакрытыка яшчэ недастаткова разгорнута на Рабфаку. Яна не зьяўляецца сыстэматычным мэтадам зжываньня недахопаў у штодзённым жыцьці. Насьценгазэта „Голас Рабфакаўца" не дапамагала разгортваньню самакрытыкі. У асноўным яна адбівала рабфакаўскае жыцьцё, але слаба адбівала сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не брала пад абстрэл канкрэтных парушыцеляў партдысцыпліны. Газэта таксама недастаткова адбівала партыйнае жыцьцё, нават да перавыбараў парткалектыву ня быў выпушчан спэцыяльны нумар. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва, якія павінны зьяўляцца галоўным мэтадам узмацненьня тэмпаў выкананьня праграмы Рабфаку і падрыхтоўцы кадраў за апошні час аслабла.

Бюро калектыву недастаткова займаецца гэтымі пытаньнямі, ў выніку чаго, маецца паслабленьне працдысцыпліны: спазьненьне і і ўход раней вызначанага тэрміну з заняткаў.

Праца па абмену вопытам з іншымі рабфакамі заглохла. Заключаныя соцумовы з Віцебскім і Аршанскім не правяраюцца.

Праца сярод настаўніцтва на сёньняшні дзень зусім не праводзіцца. Настаўніцтва недастаткова ўцягнута ў грамадзкую працу Рабфаку. [снаваўшы мэтадычны габінэт самацечна ліквідаваўся, настаўніцкі гурток распаўся.

Усё гэта зьяўляецца вынікам адсутнасьці належнага кіраўніцтва ў гэтай галіне.

Бюро калектыву недастаткова кіравала фракцыяй Прафкому ў выніку чаго, прафком мала займаўся пытаньнем культурна-бытавога абслугоўваньня студэнцтва.

Вайсковая праца на Рабфаку недастаткова. Выкладаньне вайсковай дысцыпліны адбываецца выключна тэорэтычна, у рэдкіх выпадках падмацоўваецца практыкай. Гэта зьяўляецца галоўным недахопам працы вайсковага кіраўніцтва Рабфаку.

Таксама з боку паасобнай часткі студэнтаў маецца недаацэнка важнасьці вайсковай падрыхтоўкі.

Усе гэтыя вузлавыя пытаньні работы і недахопы ў працы паказваюць, што пры ўмове напруджаных тэмпаў Бюро калектыву з дапамогай усёй партыйнай масы здолее ізжыць усе маючыяся недахопы ў сваёй працы.

Цалкам з усёй КП(б)Б, пад кіраўніцтвам Ленінскага ЦК парткалектыу Рабфаку здолен і надалей змагацца на два франты за генэрадьную лінію УсеКП(б).

Рудкоўскі і Заводнік.

АЛЕСЬ СЯЧКО*).

У кузьні Рабфаку.

Навукі
Яснае
Граніт
Грызем мы
З прагнасьцю
Упартай,
І нашы творчыя агні
Іскрацца
Сонечнасьцю яркай.

У тэмпах шпаркіх
Нашых дзён
Старыя
Крышым мы
Праграмы.
Уперад
Бураю ідзем,
Узяўшы
Ўдарніцкі напрамак.

Глытаем
Безьліч
Кніжных слоў
І мудрых
Формул,
Тэорэмаў.
Браць веды
Імкнемся напралом
У буйных віхрах
Розных тэмаў.

А думкі рупныя
Цьвітуць,
Бушуюць
Радасьцю,
Задорам.
У Марксыцка-Ленінскім гарту
Куемся
Ў кузьнях аўдыторый.

Навукі нашае
Граніт
Грамадзкай працай
Прасякаем.
Мы прагнем будучыні
Дні—
Праблему
Кадраў вырашаем.

г. Менск.

*) Алесь Сячко (Блакітны)—селянін батрак, сябра Цэнтральнай літаратурнай рабочай студыі БелАПП'у Друкуецца з 1927 г. у газэтах і часопісах. Зараз на III курсе рабфаку

Камсамол Рабфаку змагаецца з усякімі адхіленьнямі ад лініі партыі.

Камсамол разам з партыяй і пад яе кіраўніцтвам змагаўся і змагаецца з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі як супроць правага ўхілу, галоўнай небясьпекі на данным этапе, так „левым" загібам і беспрынцыпным права-левацкім блёкам Сырцова—Ламінадзе. Супроць шовінізму розных колераў; а таксама ўсякімі нездаровымі настроямі ў штодзённай працы.

За апошні год меліся з боку некаторых камсамольцаў некаторыя праявы яўрэйскага шовінізму (справа Лібіна ў прошлым годзе), антысэмітызм з боку камсамольца Кургана, які разважаў, што „яўрэі могуць толькі займацца гандлем, а не працаваць", далей ён дадае, што „зачынены разьмяркавальнік нам не патрэбен". Характэрна яшчэ выступленьне Лукерчыка у час калі разабралася пытаньне адносна права-апартуністычнай вылазкі сябра ЦК ЛКСМБ Целешава, дзе ён таксама выказваў думку аб наяўнасьці крызісу росту і актыўнасьці ў камсамоле, прыкрываючыся дробнымі прыкладамі сваёй мясцовасьці. Гэтыя ўсе праявы былі сваечасова асуджаны, як з боку бюро калектыву, так і агульным сходам камсамола, і былі прыняты адпаведныя захады як выхаваўчыя, так і арганізацыйныя.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ва ўмовах Рабфака, дзе значная частка камсамольцаў аторвана ад вытворчасьці маецца глеба для праяў розных настрояў. Камсамольскай арганізацыі Рабфаку патрэбна падняць свой тэорэтычны узровень, каб і надалей выявіць і разьбіць усякіх шкодных настрояў адкуль-бы яны не ісходзілі і сумесна з партыяй змагацца за чыстату Ленінскай бальшавіцкай партыі і Ленінскага камсамолу.

Брыскін.

Замест кучкі здраднікаў, раздаўленых сацыяльнай рэвалюцыяй, пралетарыят выкоўвае БАТАЛЬЁНЫ новых спецыялістых

Да ўдарнага выпуску Менскага дзённага і вячэрняга рабфакаў.

Адным з асноўных пытаньняў сучаснага пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца пытаньне падрыхтоўкі кадраў, неабходных для забясьпячэньня гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэта праблема і сваечасовая пастаноўка яе пацьвярджаецца хоць-бы такім фактамі, як неабходнасьць замены сшарых буржуазных спэцыялістых, частка якіх, як гэта паказалі шэраг шкодніцкіх працэсаў і у прыватнасьці апошні працэс прампартыі і раскрытая арганізацыя беларускіх контр-рэвалюцыянэраў нац-дэмакратаў,—працуюць на карысьць нашага клясавага ворага супроць дыктатуры пралетарыяту, супроць будаўніцтва сапыялізму.

Вашы выпускі ў ударным парадку сьведчаць аб тым, што кіраўнічыя арганізацыі рабфаку і ўсё студэнцтва зразумелі вострую неабходнасьць вырашэньня праблемы, гэтым самым вы дапамагаеце ў хутчэйшым вырашэньні пастаўленай партыяй задачы—падрыхтоўкі кадраў, як асноўнай задачы сучаснага пэрыяду сацыялістычнага будаўніцтва.

Вітаючы Вас, ад імя Наркамасьветы, я ўпэўнены, што пашоўшы ў ВНУ, Вы *і там таксама паўдарнаму будзеце працаваць, выпраўляючы ўсе тыя недахопы, якія да гэтага часу маюцца ў нашых вышэйшых навучальных установах, і такімі-ж ударнымі тэмпамі скончыце ВНУ, дзеля таго, каб ўліўшыся ў розныя галіны сацыялістычнага бубаўніцтва, актыўна, кіруючыся дырэктывамі партыі, ударнымі тэмпамі прыйсьці да канчатковай мэты рабочае клясы—сацыялізму.*

Наркамасьветы ПЛАТУН.

Дзевяты выпуск.

Батальоны рабочих кадров на смену вредителям „Правда".

Рабфакі, гэта тыя школы, дзе сапрауды выхоўваюцца пралетарскія і бядняцка-сялянскія кадры дзеля соцыялістычнага будаўніцтва. Штогодна — ужо 9-ты год Менскі Рабфак дае кадры для ВНУ і ВТНУ. Штогодна выпускаюцца.

Пры ранейшых выпусках частка старых спэцаў толькі рыхтавалі наступленьне на дыктатуру пралетарыяту. Сёньня яны ўжо прабуюць наступаць. Наступаюць рознымі шляхамі: шляхам шкодніцтва на гаспадарчым фронце, шляхам згавораў з імпэрыялістычнымі краінамі. І таму на сёньнешні дзень пытаньне аб кадрах застаецца важнейшай задачай данага пэрыяду. Адсюль перад кожным выпускніком павінна быць яскрава зразумелай важнасьць гэтай праблемы—праблемы кадраў.

Выпускнікі на працягу 3 з палов. год ліквідавалі сваю малапісьменнасьць і атрымалі сярэднюю асьвету.

Выпускнікі і надалей змогуць прыадалець усе цяжкасьці, якія сустрэнуцца у вышэйшых навучальных установах. Гэты выпуск заканчвае тэрмін навучаньня на паугода раней-гэта ёсьць вынік сацспаборніцтва ўдарніцтва і ўпартай працы над сабой. Думаецца, што і ў ВНУ наш выпускнік будзе паказваць прыклад у сваёй працы, будзе паказваць прыклад як сапраўды змагацца.

Вучыцца і яшчэ раз вучыцца, каб замяніць спэцаўшкоднікаў, вучыцца каб будаваць сацыялізм. Вучыцца каб мець сваіх спэцыялістых з людзей рабочае клясы.

Мінакер.

Гісторыя першага выпуску—гісторыя вячэрняга Рабфаку

Вячэрні Рабфак Б. Дз. . У быў адчынен увосені 1927 г. у складзе 2-х груп 1-га курсу.

Новы тып вучэбнае ўстановы, перад якой стаяла мэта—даць рабочым, не адрываючы ад працы на прадпрыемстве, закончаную сярэднюю асьвету і такім чынам падрыхтаваць да ВНУ і ВТНУ, — выклікаў спачатку у некаторых рабочых як-бы некаторыя сумненьні. Злучэньне вучобы і працы на прадпрыемстве, правядзеньне вучэбных заняткаў увечары—калі студэнты зьяўляюцца некалькі стамлёнымі, абмяжованая колькасьць гадзін, якія адведзены вучобе, немагчымасьць прапрацоўкі матар'ялу ў хаце (сюды-ж, магчыма, трэба далучыць і недастатковую, спачатку, цапулярызацыю Вячэрняга Рабфаку на прадпрыемствах)—усё гэта выклікала ў некаторых як-бы некаторую няўпэўненасьць у якасьці будучай вучобы новай установы; у выніку гэтага, хаця 2 групы і былі ўкамплектаваны, але наогул колькасьць пададзеных заяў была невялікая.

Апрача гэтага, шмат з ліку прынятых адсеялася на працягу вучэбнага году, з прычыны чаго ў сярэдзіне году прышлося зрабіць дадатковы набор на першы курс. З ліку 93-х студэнтаў, якія значыліся па сьпісах 2-х груп на працягу году, ў канцы году засталося 45.

У пачатку вучоба ў новым тыпу вучэбнай установы пашла як-бы вобмацкам. Успамінаецца наступны момант. Высьвятлілася, што час вучобы у клясе—абмежаваны (5 вечароў у тыдзень па 4 лекцыі ў вечар) гэты час зьяўляўся дастатковым для прапрацоўкі вучэбнага матар'ялу, але-ж гэтага часу не хапала для практыкаваньняў і належнага замацаваньня матар'ялу; значыцца, патрэбна частку вучэбнага матар'ялу выканаць па за клясай. Праца да хаты студэнтам была дадзена, але тут-жа заявілі, што ў іх няма і ня будзе часу выканаць яе.

У парадку спробы праца была дадзена Прайшло нскалькі дзён, і... праца быда выканана ня толькі у сэнсе колькасьці заданага, але-ж здавальняючы адносна якасьці. Гэта апрадзяліла характар заняткаў (прапрацоўка матар'ялаў у клясе і выконваньне часткі працы дома), і у канцы году праграма была выканана.

1928-1929 г. У той час, калі на 1-шы курс было пададзена звыш 200 заяў і было прынята каля 150 студэнтаў, на 2-гі курс перайшло толькі 45 студэнтаў. Значыцца, трэба было ўтварыць прыёмі на 2-гі курс. Новыя ст-ты, залічаныя на 2-гі курс, адразу-ж ўвайшлі ў вучобу, і праца пайшла з большым вопытам, чым ў папапярэднім годзе.

Трэба адзначыць, што з пачатку году некалькі адсутнічала дыстыпліна. Тады ў групах арганізаваліся тройкі, якія павялі адпаведную працу. У выніку гэтага наведваньне заняткаў з 65 70 проц. падняло ся да 90-100 проц.: з ліку 38 т. т. па сьцісу роўна а 6-й гадзіне на месьы было 36; гэта наглядалася не як выпадковае зьявішча, але-ж на працягу 5-6 месяцаў. Гэта пры ўмовах вучобы на Вячэрнім Рабфаку было значным дасягненьнем.

Адсеў на 2-м курсе быў вельмі нязначным. Вучэбная праца ішла бадзёра, плянамерна, ня гледзячы на перагрузку студэнтаў і на прадпрыемствы і па лініі грамадзкай працы.

1929-1930 г. На 3-ці курс перайшло 60 ст-аў, новых ст-таў было прынята толькі 9 з ліку 22-х падаўшых заявы.

Заняткі ў гэтым годзе адбываліся ў некалькі іншых умовах, чым у папярэднім годзе.

З аднаго боку,—студэнты Вячэрняга Рабфаку—рабочыя непасрэдна працуючыя на прадпрыемствах, згодна пастановы СНК БССР, сталі працаваць 6 гадзін; гэта дало магчымасьць студэнтам больш займацца дома.

З другога боку,—некаторыя студэнты атрымалі адказныя заданьні былі высунуты на працу у праверкомы і па чыстцы саўапарату, некаторыя студэнты былі накіраваны на працу ў раен, некаторыя ў якасьці вылучэнцаў пачалі працаваць на адказных пасадах. Такім чынам, перагрузка па грамадзкай працы, а таксама праца на прадпрыемствах і ў установах былі прычынай таго, што паасобныя студэнты наведвалі заняткі з перабоямі, а потым павінны былі наганяць прапушчанае. Для некаторых студэнтаў былі ўведзены дадатковыя заняткі. Адчувалася некаторая напружанасьць у занятках.

1930 год. На 4 курс перайшло 45 студэнтаў. У тым ліку ў 20-ю групу канчаикова было адабр 21 студэнт. 1-га верасьня пачал заняткі. Адначасова паустала і таньне—калі аслабаняць ад пр на прадпрыемстве і перавядуць дзённыя заняткі? Праз некал дзён на гэтыя пытаньні быў ат ман адказ—1-га кастрычніка чалі рыхтавацца. Некаторым дэнтам, майстрам цэхаў і квал каваным рабочым, ня лёгка б пакінуць працу на прадп емстве. Аднак 2-га кастрычні 20-я група прышла на рабфа 8-й гадзіне раніцы.

2 з паловай месяцы вучобы аслабаненьні ад працы на п прыемстве... Гэта, як мо сказаць некаторыя, асабліва дэнты ранішняга Рабфаку. выключна вучыліся 3 з палов. ды, зьяўляецца недастатковым

Але-ж вучоба была напружа па 9 лекцый у дзень. Часта маліся і ў выхадныя дні. Папя няя вучэбная падрыхтоўка за гады на рабфаку, агульнае а сама і грамадзка-палітычнае р віцьцё студэнтаў, адабраных тую груцу,—ўсё гэта дало што сёньня вячэрні Рабфак—п прыемства, на якім працуюць рабочых, выпускае сваю пер прадукцыю—21 студэнта.

Аглядаючыся на пройдзены ш падрабязна правяраючы яка выпускаемай сёньня праду мы кажамі

—Вы 21 падрыхтаваны для няткаў у ВНУ ВТНУ. Мы ня жам, што ў Вас ня будзе н шурпатасьцяў на першых п вучобы ў ВТНУ. Вас могуць сустрэць цяжкасьці. Але р пралетарскаа вытрыманасьць чэбная падрыхтоука зьяўля гарантыяй таго, што гэтыя касьці вы здолееце і выкан тыя заданьні, якія Вам, як буд чырвоным спэцыялістам, да Партыяй і Саўуладай.

Дык уперад жа да вышэ спэцыяльнай асьветы.

Няхай жыве УсеКП(б), ава рабочае клясы, кіраўнік кул нага будаўніцтва, кіраўнік па тоўкі кадраў.

Сімано

Наш шлях.

Вельмі цяжкі шлях працы прайшла ўдарная выпускная група Вячэрняга Рабфаку. Ня гледзячы на гэтыя цяжкасьці, мы атрымалі адпаведную падрыхтоўку і скончылі яё. Трэба адзначыць, што з боку партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый ня было дастаткова зьвернута ўвага вячэрнаму Рабфаку. Толькі дзякуючы ўпартай працы мы ўсе гэта дабіліся.

Гісторыя нашай выпускной групы—гэта гісторыя вячэрнага Рабфаку. У першым годзе нашых заняткаў 1927/28 навуч. год амаль штодзённа зрывалі заняткі. Як настаўнікі, так і студэнты ня ведалі, каго і што павінен падрыхтаваць вячэрні Рабфак. Адсюль пропуск заняткаў, як з боку настаўнікаў, так і з боку студэнтаў. Толькі ў 1928/29 навуч. годзе, калі Саўнарком вынес пастанову аб аслабаненьні рабочых, якія займаюцца на вячэрнім Рабфабку на 2 гадзіны раней ад вытворчасьці, заняткі пачаліся ў лепшых умовах. Тады, былое правапартуністычнае кіраўніцтва Наркамасьветы дало распараджэньне аб пераглядзе праграм вячэрняга Рабфаку і пераход з 4-х на 5-ці гадовы курс навучаньне. Гэта пастанова дрэнна адзывалася на студэнцтве і атрымаўся значны адсеў.

І вось маленькай групай мы дашлі да 4-га курсу. На гэтым курсе нас перавялі на ранішнія заняткі і мы аказаліся на правох бясprытульных. З-за недагаванасьці ў нас зняткі часта зрываліся, ганялі нас з пакою ў пакой. Праўда, за апошні час наглядаецця пералом з боку парткалектыву ранішняга Рабфаку да кіраўніцтва вячэрнім Рабфакам (тры гады вячэрні Рабфак быў амаль што без усякага парткіраўніцтва) і ўсё-ж такі вячэрні Рабфак яшчэ не стаіць на тэй вышыні, якой павінна стаяць навучальная ўстанава, якая рыхтуе рабочых да вышэйшых школ. Рабфак, як прадпрыемства, якое працуе на 2 зьмены пагэтаму павінна быць аднолькавай зацікаўленасьці і да другой зьмены—гэта значыць да вячэрнага Рабфаку. Пералом ёсьць і трэба яго толькі замацаваць.

Хошыцар.

МАРК ПРОЦЬК

Ударным групам 9 выпуску студэ. Менскага Рабфаку прысьвячаю.

Дзевяты ўдарны.

І, здаецца, ўчора ад труб дымакурных,
І, здаецца, ўчора ад грунату сталі.
Нашы дні над вучобай нязьведана бурна
Грознай хваляй плылі у бязьмерную далеч.

Сёньня мы на парозе ў прастор, у дарогу,
Каб ісьці няўтомна... Гарэць барацьбой.
Дык сьмялей жа, таварыш, бяз жаху, трывог
Па шляху няхай грозна гучыць поступ твой

Нашы дні ня змыкаюцца ў полі наротна,
Мы, што шквал, крочым у даль уперагон.
І ня дарам грухоча завод пяцігодкі,
І ў налгасных абшарах машыны стозвон.

Нашы дні—дні будоўлі, цэмэнтнага ўсплёск
Рэйдам сьмелым праходзяць балоты, імша
Мы ствараем з старой налгасную вёску
Пад машынныя, гучныя, сьмелыя ўдары.

Ты, дзевяты, ударны ў паходзе ўдарным
Шпарнім кронам ідзі да патрэбнай мяжы,
Хоць дарога ня проста, і дзень часам хмарні
У падарожжы тваім праімжыць.

г. Менск,

*) М. Процька—селянін бядняк, сябра Цэнтральнай літ на-рабочай студыі БелАПП'у. Друкуецца з 1928 г. у газэтах пісах. Зараз на другім курсе Рабфаку.

Больш увагі мове.

Сыстэма галін, вызначаемая вучэбным плянам нашага Рабфаку, ставіць перад сабой вялікія задачы выхаваўчага, адукацыйнага і практычнага характару. Канкрэтна, мы ставім перад сабой задачу праз гэтую сыстэму галін даць рабфакаўцу марксыцка-ленінскае выхаваньне, узброіць яго марксыцка-ленінскім мэтадам, даць законченую сыстэднюю асьвету і неабходныя навікі для пасьпяховага навучаньня у ВНУ і ВТНУ. Кожная галіна, уваходзячы ў сыстэму галін выконвае сваю ўласьцівую ёй функцыю. Адно з месц у гэтай сыстэме адводзіцца і мове. Функцыі мовы ў сыстэме галін—надзвычайна вялікія і важныя. Гэта магутнейшы сродак, пры дапамозе якога мы передаем і ўспрымаем веды. І чым лепш уладаюць мовай, і настаўнік, і рабфакавец, тым большы посьпех ці ў нас на фронце вучобы. Зусім адваротнае будзе, калі мы гэтай магутнай зброяй будзем уладаць слаба. Студэнт мучаецца, здабываючы веды, калі ен дрэнна ўладае мовай. Там, дзе трэба патраціць хвіліны, трацяцца цэлыя гадзіны, трацяцца дарэмна і беззваротна.

Ня гледзячы на вялікую важнасьць мовы, якой яна павінна карыстацца ў сыстэме нашай працы, мы маем на практыцы некаторую недаацэнку гэтай важнасьці мовы, а разам з гэтым і цэлы шэраг прарываў. Канкрэтных прыкладаў гэтае недаацэнкі вельмі многа. Перш за ўсе хочацца асабліва подкрэсьліць хваравітыя і ганебныя традыцыі, якія існуюць у нас на Рабфаку: гэта традыцыя дзяліць галіны на галоўныя і другарадныя. Пры гэтым падзеле мова, канечна, пападае ў разрад другарадных. І калі пры пераглядзе сеткі гадзін, выявіцца, што трэба яе скараціць, дык перш за ўсё глядзяць, ці нельга абрэзаць мову і літаратуру. Трэба адкрыта сказаць, што ні адна галіна не працярпела такога „абразаньня“, як мова.

Наглядаецца недаацэнка моў і з боку студэнтаў, якая выяўляецца ў адносінах да пісьмовых прац. Дыскусія аб тым, патрэбны пісьмовыя працы ці не, гэта вечнае пытаньне ў практыцы нашага студэнта. Недаацэнка мовы з боку студэнцтва выяўляецца ня толькі ў аднэй дыскусіі. Яна выялўяецца і ў адносінах да колькаснага і якаснага выкананьня саміх прац. Колькі ня выканана студэнтамі праграмных пісьмовых прац, проста падлічыць цяжка. Яшчэ і сёньня, прыходзіцца ўпрашваць студэнта, каб ён паклапаціўся напісаць і падаць працу... Ня студэнт шукае настаўніка, падаць яму працу, а наадварот настаўнік студэнта. Якасьць працы вельмі часта бывае куды ніжэй, чым бы яна сапраўды магла быць. Гэта сьведчыць аб абыякавасьці ў адносінах да якаснага выкананьня.

Прарываў на фронце мовы ў нас шмат. Яны залежаць ад недаацэнкі гэтае важнае галіны. Трэба ліквідаваць гэтыя прарывы ў нашай практыцы, а каб ліквідаваць прарывы, дык перш за ўсё для гэтага патрэбна больш увагі з боку ўсяго рабфакаўскага калектыву.

Настаўнік.

ШТО МНЕ ДАЎ РАБФАК?

Дзякуючы ўмеламу падыходу.

Не гавор чы аб агульнай адукацыі, атрыманай за 3 з палов. гады навучаньня на рабфаку аб якіх я маней у сваіх умовах будучы батаком ня мог і марыць, я атрымаў часу майго паступленьня на Рабфак здавальняючую палітпадрыхтоўку і самае галоўнае-ідэолёгічнае выхаваньне.

Я прышоў на Рабфак з дробнабурасьніцкімі поглядамі. На ўсё азіраў з уласнага індывідуалістычнага пункту гледжаньня. У ацпытаньні ў мяне таксама былі некаторыя погляды адсталай масы вёскі—спадчына самаўладзкай палітыкі да нацпытаньня.

Умелы падыход партыйнай камсамольскай і грамадзкіх арганізацый да пытаньня і справядлівае іх вырашэньне, здаровля ў асноўным пралетарская маса і нарэшце добрыя адносіны з боку таварышоў, хутка далі магчымасьць разабрацца ў тым ці іншым пытаньні як яно у сапраўднасьці і падыйсьці да яго клясава, з пункту погляду пралетарыята.

М. Лобаў..

Навучыцца замяніць Рамзіных і Асадчых.

Рабфак зьяўляецца дзіцём кастрычнікаўскіх заваёў. Мы зараз ужо маем шмат адказных працаўнікоў, якія прайшлі праз сьцены Рабфаку. Ранейшыя малапісьменныя зараз працуюць на адказных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Я таксама на Рабфак прышоў. зусім малапісьменным. За 3 з пал гады Рабфак даў мне ня толькі веды па фізыцы і матэматыцы, але і ўзброіў па асноўным палітычным пытаньням, навучыуся падыходзіць да ўсяго з клясавага пункту гледжаньня.

Мы выпускнікі, скончыўшыя ударным парадкам Рабфак, атрымалі адукацыю дзеля паступленьня ў ВНУ і ВТУ, а праз некалькі гадоў замяніць Рамзіных, і Асадчых і іншых агэнтаў імпэрыялізму.

Усе ускладзеныя на нас абавязкі, будзем выконваць аддана наколькі хопіць ведаў і сіл.

Былы грузчык ст. Капцэвічы
Дзягцяр.

Астаўшыся матар'ял будзе надрукован у насьценгазэце.

אייניגע סאכאלען צום ערשטן ארויס-לאָז פֿון דער יידאָפּטיילונג באם ארבפֿאק.

אין 1927-28 לערניאָר האָט זיך באם מינסקער ארבפֿאק געעפנט א יידאפטייל. היינט, וען פֿון יענער צייַט איז דורכגעאַנגען 3 1/2 יאָר, שניידן מיר די ערשטע געראטענישן. היינט לאָזט אַרויס דער מינסקער באָטאניקער אַרבפֿאק 47 ארבעטער און פֿויערים, וועלכע האָבן אים געענדיקט. צווישן די 47 געפינען זיך 20 וועלכע האָבן געענדיקט דעם יידאָפּטיילונג. סאָ איז דער ערשטער אַרויסלאָז פֿון דער אָפּטיילונג. וואָס קענען מיר, די ערשטע, וועלכע האָבן געענדיקט דעם יידאָפּטיילונג, זאָגן? וועלכע סאַכאַקלען קענען מיר אונטערפֿירן פֿאַר די 3 1/2 יאָר. דורכמאכנדיק דעם קורס פֿון אדבפֿאק?

דער גאנצער ארבפֿאק, די יידאפטיילונג, ווי א טייל פון גאנצן, האָט געוואַלטן מענטשן, וועלכע זיַינען געקומען פון וואַרשטאָט, פון פעלד, פֿאַרשטיקע נאָכ וויסן נאָכ בילדונג אין האָט אופֿגעהויבן זייער קולטורעלן באָוווסטזיין, האָט זיי געגעבן מיטעלע בילדונג, אוון האָבן זיי צוגעגרייט פֿאַר די הויכשולן, קדמיי רערנאָך זאלן זיי קענען ברענגען נוצן אונזער פּראָלעטאַריישעט מעלוכע. דאָס אלץ זאגט וועגן דעם, אז אונזערע דערגרייכונגען זיינען גרויס. אייניציטיק מוזן מיר אנמערקן די שוועדיקייטן און פֿעלערן, וועלכע זיינען געוען בא אונז, דורכמאכנדיק דעם צייט-אפשניט.

די קאמאנדירנדיקע אָרגאנען (פּראָפֿאַריינען, ראטן א.א.) זיינען ניט צוגעגאנגן ווי געהעריק צום אָפּקלייב כאָווירים פֿאר דער ידאָפּטיילונג, מ.האָט דעם אפטייל זייער ווינציק פּאפולירן. דערפֿון צווישן יידישע אַרבעטער. דערפאר האָבן מיר ווינציק ארבעטער פֿון שווערער אינדוסטרי אף דעם אפטיילונג. דערפֿאר האָבן מיר אַזא גרויסן פּראצענט כאווירים פֿון קליינער קוסטאָרישער אינדוסטרי. אז מיר זאָלן נאָר צוגעבן צו דעם נאָך א טייל כ.כ, וועלכע האָבן ניט געוואָלט גיין אפֿן יידאָפּטיילונג (זיינען גענגן, וויל האָבן קיין אנדערע קאמאַנדירונגען ניט געהאט), וועט קלאָר פֿאַרוואָס ס.האָבן געהערשט ניט געוונטע שטימונגען (טראָצקיסטישע, שאווינסטישע א. א.) אין די גרופּעס. אף דער אקאדעמישער ארבעט האָט זיך זייער שלעכט אפגעפֿונען, וואס ס.זיינען ניט געווען קיין צוגעפאַסטע אויסגעארבעטע פּראָגראַמען אוון קייען אוא וועלכע זאָלן אונז העלפֿן אין אונזער ארבעט.

דאָס איז דער ערשטער פּראָבלעם, וואָס שטייט פֿאַר אונז. דער צווייטער איז, ווי צו ארבעטן מיט דער מאסע. ווי צו ברענגען צו זיך דעם ווילן צו לערנען, ווי צו ענטוזיאזמירן זיי צו דער ארבעט. דאָס איז דער ערשטער פּראָבלעם, וואָס שטייט פֿאַר אונז. דער צווייטער איז, ווי צו ארבעטן מיט דער מאסע. ווי צו ברענגען צו זיך דעם ווילן צו לערנען, ווי צו ענטוזיאזמירן זיי צו דער ארבעט. דאָס איז דער צווייטער פּראָבלעם, וואָס שטייט פֿאַר אונז.

דאכט-זיך וואס? אלץ איז קלאר.. אלץ איז איינפאך. אלץ פֿאַרשטענדלעך, נאר... ניט איינגעקייט ביזן סאָפּ.

דער לערעד צאַצקעט זיך מיטן דרייעקן-געפלעבט. ער רעכנט אויס אונ רעכנט איבער... אלץ שטימט אונ אלץ נייט זיך צונויף.

פֿון דער העלער הויט שפרינגט אַרויס דער ערשטער קלאָצ-קאַשטן-פֿרעגער מיט א שפּאָגל נייער פֿראגע:—כאָווער לערער, וואס איז דאס פאר א קרייז? מיט דאכט זיך, אז ס.איז א קרייז. קען דען א קרייז אויס-זען, ווי א קרייז, וועט ער זיך טאקע אויס ווי א קרייז?

אזוי שטעלט זיך אַוועק דער כ. ל. וואָס פֿרעגט שטענדיק, וואָס מען זאָגט (אוא טעווע איז בא אים אונ גיי מאַכ עפעס).

דאָ כאפּן מיר זיך, אז פֿון דער געשפּאנטער שטילקייט איז שוין לאַנג קיין זייכער ניט געבליבן... פֿון א ווינקעלע קרייען איט דער כ. ג... מיט א יונג הענעריש קעלעכל,, „איכ בין אויכ דאָ“.

דאָ טאקע כאָפּן זיך אופֿ די לאַנג מען (די וואָס זיינען געווען פֿלעגן זיך אפֿט בייטן). ס'האָט זיך געפֿילט א מאַנגל אין יידישע לערנבוכער. מיר האָבן ניט געהאט קיין צוגעפֿעסטיקטע לייערער. די לערער אף שפראכן האָבן לאַנג זייער אפּ שפראכן אפט געבּיטן: דעם קורס פֿון ווייסרוסיש האָבן מיר דורכגעמאכט פֿאר דער צייט מיט דריי לערער, פֿון רוסיש מיט פֿיר.

דאָס האָט געבראכט דערצו, וואָס דער אפּפּאַראט אין דער ידאָפּטיילונג איז א גרעסערער ווי אין ארבפֿאק אין אלגעמיין. פֿון 32 מענטשן, וועלכע זיינען אגגעקומען אף דערדאָזיקער אפּטיילונג, ענדיקן נאָר 20. פֿאַרשטענדלעך, אז צוויישן די, וועלכע זיינען אָפּגעפֿאלן זיינען פֿאַראן אויך סאָציאַל פֿרעמדע צו אונז מענטשן (סטרוביעווסקי, קאפּעליעווישט, אפּלבוים), וועלכע, אדאָנק דער דיכטיקער אנפֿירונג פֿון פּאַרטיי-קאלעקטיוו, זיינען אופֿגעדעקט און ארויסגעשליידערט געוואָרן. די אלע מאמענטן, זאָגן וועגן דעם, אַז די אָרטיקע אָרגאניזאַציע דאַרפֿן מערער ליינן אכט אף דעם אפּקלאַסיפֿן פֿון קאַנדידאַטורן אין ארבפֿאק, דאַרפֿן ברייטער פּאפּולאריזירן צווישן יידישע אַרבעטער דיי ידאפטייל פֿון מינסקער אַרבפֿאק.

ס'איז פֿאַרשטענדלעך, אז זייַענדיק די ערשטע פּיאָנערן פֿון א נאַציאָנאַלער גרופּע בּאַם ארבפֿאק, האָבן מיר ניט אויסמיידנדיק געמוזט דורכמאכן א שווערן וועג, קעדיי אף די שווערי-קייטן אוועקשטעלן אין די וויַטער-דיקע יידישע גרופּעס גוט די ארבעט, רעזולטאטן זיַינען שוין פֿאראן. איצט האבן מיר שוין אפֿן ארבפֿאק 5 יידישע גרופּעס, וועלכע לערנען זיך אין אסאך גרינגערע באדינגונגען (האבן א ריי צוגעפֿעסטיקטע לערער, אפראגראם א. א.). ניט קוקנדיק אף שווערקייטן, האָבן די 20 מענטשן געענדיקט דעם ארבפֿאק אף 6 כאראקטיר, ארויס דעם סאָצ-געווען. זיי פֿילן, אז דער ארבפֿאק האט זיי געגעבן די געהעריקע צוגרייטונג קריי זיך צו לערנען וועלכע אין די הויכשולן. קיינע שווערקייטן וועט זיי ניט אפשרעקן.

פֿאַרווס! נאָכ מיט גרעסערע טעמפּן, מיט מערער ענערגיע, אויסנוצנדיק דעם מעמאד פֿון סאָצ-געווען אין שלאָג ברייגאדעס, געבן דאס לאַנד פּראָלעטאריש ספעציאליסטן, וועלכע וועלן פֿאַרבייטן די ספעציאליסטן, שעדיקער, וואס שטרעבן אונטערצוארבייטן אונזער סאציאַליסטישע בויונג.

הייפמאן.

פעליעטאָן

א שאָ אין זיבצנטער גרופּע

דער טומל, וואָס הערשט, וויַ געווינלעכ, אין ארבפאקישע קאריאַרע אוון אין זיינע ליכטיקע גרויסע צייטן, שטעלט זיך איין אוו ס.ווערט שטילער אוו שטילער, מען וואַדפט זיך ארופּ מיט ענשוויאַזם אוו ברעג אפּ די ביכער אוו ס.גייט אוועק א סעדרע פון לערנען מיט האַסמאדע אוו כייטשעק. ביסלעכווייז שטילט זיך איין אויכ אונזער גרופּע... שא אוו שטיל... אפּילע דאס קלאַפּן פון אייגענעם האַרצ קענסטו דערהערן, אוו ס.דאכט, אז, אָט, אט וועט דאס ארויסשפרינגען פון ברוסט-קאסטן—שיידל, וואַדטניק מיט אופּגעדופֿלט אפּן נייעם, נאָכ ניט געהערטן, נאכ ניט געלערנט לימעד. די פענימער ציען זיך אויס פֿאר-קנייטשנדיק רעם שטערן אין ארויס-שיקנדיק פֿאַדויס די פֿייגשמעקנדיקע נאָזן.

דער לערער האָלט שוין וויַט, מיט ניכטערע ווערטער ברעכט ער איין פֿאַרמולע נאכ פֿארמולע, לעגט זיי אויס, ווי פֿרישן-געבאַקענע, צאצקע-דיקע בולקעלעכ, וואָס בעטן זיך מיט דאַכמאנעס אוג-פֿאַדער - פענימער:— שלונגט אונז איין, צעקייט אונז—, מיר שלינגען אוו קייען אוו ווערן